Уваскрасенне Хрыста як надзея для ўсяго чалавецтва

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
21.04.2019 00:00



У чарговы раз перажываем велікодную раніцу, спазнаючы праўду аб уваскрасенні нашага Пана Езуса Хрыста. Праўду, якая напаўняе радасцю сэрцы хрысціян.

Аднак варта ўсвядоміць, што вымярэнне гэтай урачыстасці нашмат большае ды важнейшае, паколькі значэнне пустой магілы трэба шукаць не толькі ў кантэксце жыцця вернікаў, але таксама ўсяго чалавецтва і актуальных выклікаў, якія перад ім стаяць. Дзе нь перамогі

Сёння мы ўвесь час чуем пра разнастайныя несправядлівасці і цяжкасці, якія закранаюць людзей у розных краінах на розных кантынентах. У сваім акружэнні таксама сустракаем шмат людзей, што змагаюцца з разнастайнымі праблемамі, якія пазбаўляюць жадання рухацца наперад, адбіраюць надзею, што ўсё можа быць па-іншаму – лепш. Некаторыя нават губляюць ахвоту жыць, перастаюць верыць у справядлівасць і праўду, у перамогу дабра над злом. † У свеце столькі людзей, якія нястомна задаюць сабе і іншым цяжкія пытанні... Як жыць тым, хто страціў дах над галавой? Тым, хто з-за адсутнасці працы пакідае свае сем'і і адпраўляецца ў іншыя краіны, шукаючы сродкаў на існаванне? Як жыць тым, каму з-за вайны трэба пакінуць свой здабытак і ўцякаць у невядомасць, не маючы нічога? Што павінны сказаць бацькі сваім памiраючым ад голаду дзецям? Як пераадолець прорву несправядлівасці і няроўнасці, якая існуе паміж людзьмі – усё ж, усе мы з'яўляемся дзецьмі аднаго Айца і, хіба, заслугоўваем аднолькава годных і паважлівых умоў існавання?



Не ўдасца хадзіць кругом ды навокал і казаць, што ўсё цудоўна і ідзе ў правільным накірунку. Трэба стаць у праўдзе і прызнаць: нягледзячы на тэхнічны прагрэс і дасягненні ў навуцы, эканоміцы і іншых сферах чалавечага жыцця мы не вырашылі яшчэ

ўсе задачы, што стаяць перад намі, людзьмі.

Пасха – гэта штосьці большае, чым чарговы дзень, адзначаны чырвоным колерам у календары. Гэта дзень перамогі жыцця над смерцю, дабра над злом, святла над цемрай, Хрыста над д'яблам і грахом. І так, як поўнасцю змянілася жыццё апосталаў пасля нядзельнай раніцы, калі яны знайшлі пустую магілу, павінна змяніцца жыццё кожнага канкрэтнага чалавека і ўсяго чалавецтва, якое перажывае чарговы ўспамін уваскрасення Пана. І не можа быць інакш.

Дзень новага жыцця

Чалавецтва не вучыцца на памылках, якія раз за разам здзяйсняе. Нават са страшэнных крывавых войнаў XX стагоддзя не здольна зрабіць адпаведных высноў; стоячы на парозе 3-яй сусветнай вайны, яно не хоча нават падумаць аб наступствах. Можа падацца, што сучасным светам кіруюць эксплуатацыя, падман, несправядлівасць, правіла, што выстаіць мацнейшы, больш бязлітасны...

У кантэксце тых страшных падзей, сведкамі якіх мы з'яўляемся, асаблівае значэнне мае праўда пра ўваскрасенне Хрыста. Прыняць яе – значыць усвядоміць, што Бог непасрэдна прысутнічае ў гісторыі чалавецтва і ў жыцці кожнага канкрэтнага чалавека; што Яго моц дзейнічае ў малых і безабаронных, якія церпяць прыгнёт і несправядлівасць.

Пустая магіла нашага Збаўцы з'яўляецца сімвалам надзеі і веры ў тое, што дабро, праўда і справядлівасць урэшце перамогуць. Падабаецца гэта камусьці ці не, але іншай надзеі чалавек не мае – толькі ўваскрасенне Хрыста ўказвае шлях да перамены свету ў лепшы бок. Трэба, каб усё зло, несправядлівасць і жорсткасць сённяшніх часоў былі знішчаны. Трэба, каб паўстаў новы чалавек – напоўнены любоўю, дабрынёй і шчырасцю. Толькі так здзейсніцца ўваскрасенне. Таму праўда велікоднай раніцы, хоць гэтая падзея адбылася ўжо больш за 2000 гадоў таму, сёння яшчэ больш актуальная. Мы павінны ўсвядоміць: разам з уваскрасеннем Пана кожны з нас пакліканы да новага жыцця.

Дзень сапраўднай радасці

Уваскрасенне Хрыста як надзея для ўсяго чалавецтва

Аўтар: кс. Ян Раманоўскі
21.04.2019 00:00



